■ «Еўрабачанне-2017»

# Беларусь зладзіла пікнік на ўзбочыне,

## Расія пад пытаннем, а букмекеры ставяць на Італію

**Гурт Naviband завяршыў здымкі часткі відэазівізітоўкі, якая прадставіць сёлета нашу краіну на конкурсе ў Кіеве. Галоўнай тэмай роліка сталі шчырыя эмоцыі і пачуцці артыстаў. Каб паказаць іх як мага паўней, здымачная група зазірнула ў Пакой ілюзій у сталічным Музеі папулярнай навукі, а таксама ў адну з гісторыка-культурных славутасцяў Беларусі — музейна-палацавы комплекс «Мір», зладзіла пікнік на прыродзе і праехалася разам з выканаўцамі па мінскіх вуліцах на... скейтах.**

«Канчатковы варыянт візітоўкі падрыхтуюць кіеўскія рэжысёры, калі ўсе дэлегацыі прыбудуць ва Украіну і будзе знята другая частка відэа. Мы ж выканалі ўсе пажаданні арганізатараў і па тэматыцы, і па якасці здымак», — адзначыў каментатар «Еўрабачання», журналіст Агенцтва тэленавін Яўген Перлін.



Днямі таксама стала вядома пад якім нумарам беларуская музыкі выйдуць на сцэну «Еўрабачання-2017». У другім паўфінале, які адбудзецца 11 мая, Арцём Лук'яненка і Ксенія Жук з песняй «Гісторыя майго жыцця» выступяць 15-мі з 19 удзельнікаў. Адкрые другі паўфінал Сербія, а апошнія акорды ў ім возьме Ізраіль. У першым паўфінальным канцэрце, які пройдзе 9 мая, выступіць 18 краін, першай з якіх стане Швецыя, а апошняй — Латвія.

Заўважым, што арганізатары шоу — а менавіта яны апошнія некалькі гадоў вызначаюць парадак конкурсных нумароў, каб выключыць збег падобных кампазіцый і зрабіць тэлеэфір больш цікавым, — улічылі ў размеркаванні і Расію. Паводле рашэння арганізатараў, Юлія Самойлава будзе спяваць у паўфінале разам з беларусамі, 11 мая, пад нумарам 3. Праўда, дагэтуль так і не стала зразумела, якім чынам здзейсніцца гэта выступленне, — Служба бяспекі Украіны на 3 гады забараніла расійскай удзельніцы ўезд на тэрыторыю краіны за парушэнне ўкраінскага заканадаўства (маецца на ўвазе наведванне Крыма некалькі гадоў таму). Расійскія тэлевізійнікі ў адказ заявілі, што абраная спявачка прадставіць краіну ў 2018 годзе, калі не будзе дапушчана да ўдзелу ў конкурсе сёлета. Еўрапейскі вяшчальны саюз, са свайго боку, афіцыйна абвясціў, што імкнецца стварыць для ўсіх удзельнікаў роўныя ўмовы ў адпаведнасці з правіламі конкурсу і стараецца вырашыць сітуацыю такім чынам, які задаволіў бы абодва бакі. Зрэшты, адзін з «нейтральных» варыянтаў — арганізаваць выступленне расійскай спявачкі прамым уключэннем праз спадарожнік — і Расія, і Украіна адхілілі. На дадзены момант кропка ў гэтай справе так і не пастаўлена, але дыялог працягваецца.



Фота прэс-службы БТРК.

Між тым букмекерскія канторы, якія працягваюць прымаць стаўкі на магчымых пераможцаў «Еўрабачання-2017», чарговы раз перетасавалі тройку лідараў. Паводле найбуйнейшай брытанскай канторы William Hill, найбольшыя шанцы на трыумф захоўваюцца ў «хлопца з малпай» — прадстаўніка Італіі Франчэска Габані, а на другім і трэцім месцах могуць апынуцца яшчэ два салісты — выканаўцы са Швецыі і Балгарыі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.25 | 19.59 | 13.34 |
| Віцебск — | 6.13 | 19.50 | 13.37 |
| Магілёў — | 6.15 | 19.49 | 13.34 |
| Гомель — | 6.14 | 19.43 | 13.29 |
| Гродна — | 6.41 | 20.13 | 13.32 |
| Брэст — | 6.44 | 20.11 | 13.27 |

## Месяц

*Поўня 11 красавіка. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

***Пр.** Алы, Ганны, Ларысы, Васіля, Гаўрылы.*
***К.** Юліі, Дыянісія, Максіма, Севярына.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 8 КРАСАВІКА

**1341** год — на Капіталійскім узгорку ў Рыме, у Сенацкім палацы, дзе сёння засядае Муніцыпальны савет, быў увенчаны лаўровым вянком 36-гадовы Франчэска Петрарка. Гэта было здзейснена ў знак прызнання яго найлепшым паэтам і найдасканалейшым знаўцам антычнай літаратуры. Падзея была знакавай: менавіта так пасля тысячагадовага перапынку адрадзілася старажытная грэка-рымская традыцыя ўвянчання лаўрамі выдатных асоб. Дарэчы, прапанову правесці такую «каранацыю» адначасова даслала Петрарку і парыжская Сарбона, але той аддаў перавагу Рыму.



**1800** год — дата нараджэння Келясціна Іванавіча Брэна, беларускага краязнаўцы, фалькларыста, этнографа. Скончыў Брэсцкае вучылішча, Жыровіцкую духоўную семінарыю. Служыў настаяцелем царквы ў в. Стары Корнін Бельскага павета Гродзенскай губерні. Збіраў матэрыялы пра абрады, народныя гульні і забавы. Адзначыў некаторую архаічнасць у беларускім фальклоры, што дало яму магчымасць лічыць беларускую народную творчасць адной з самых старажытных у славянскім рэгіёне. Аўтар працы «Мясцовае этнаграфічнае апісанне Бельскага павета...», прысвечанай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага насельніцтва на тэрыторыі Падляшша (цяпер Беласточчына). У ёй змешчаны 38 народных песень, у тым ліку 14 вясельных з апісаннем вясельных абрадаў, а таксама шмат загадак, прымавак, казак, дадзена параўнальнае апісанне побыту беларусаў і мазураў. Да працы прыкладзены малюнкі адзення, рыбалоўных прылад, планы жылых і гаспадарчых пабудоў. Рукапіс захоўваецца ў архіве Геаграфічнага таварыства Расійскай Федэрацыі ў Санкт-Пецярбургу. Памёр у 1875 годзе.

**1872** год — у Пецярбургу выйшла ў свет першае рускае выданне «Капітала» К. Маркса (першы том). Цэнзура недаацаніла рэвалюцыйнае ўздзеянне кнігі, напісаўшы ў заключэнні: «Нямногія прачытаюць, а яшчэ менш зразумеюць яе». Сам К. Маркс напярэдадні выхаду першага тома «Капіталу» пісаў, што гэта — «самы страшны снарад, які калі-небудзь быў пушчаны ў галаву буржуа...».

**1903** год — нарадзіўся (пыг. ст. Пціч Петрыкаўскага раёна) Назар Яўстратавіч Герасіменка, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі горада стварыў і ўзначаліў падпольную антыфашысцкую групу. На яго кватэры па вуліцы Няміга знаходзілася канспіратыўная яўка падпольшчыкаў: тут праходзілі сустрэчы, нарады, прымаліся сувязныя партызанскіх атрадаў, захоўваліся зброя, медыкаменты, нелегальная літаратура. З мая 1942 года — сакратар Сталінскага падпольнага райкама партыі. У кастрычніку 1942-га Н. Герасіменка, яго жонка Таццяна і 12-гадовая дачка Люся былі схоплены фашыстамі і пасля катаванняў пакараны смерцю. Імем Назара Герасіменкі названа вуліца ў Мінску.

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ,**
**празаік, паэт, публіцыст:**
*«Ёсць імгненне жыцця,*
*і імгненне смерці,*
*І імгненне веры ў вечнасць жыцця».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Мужык выпіў — усё забыўся, жанчына выпіла — успомніла ўсё-ё-ё!**

Урач раіць хвораму:
— Я лічу, што вам усё ж варта пагадзіцца на аперацыю.
— Ніколі! Лепш памерці!
— Ну, дык адно другому не перашкаджае...

**Кожны дзень, вяртаючыся дадому, Пётр чытаў сямейнае становішча жонкі ў «Аднакласніках». «Замужам» — значыць усё добра. «Разведзеная» — яго дома чакае скандал. Але калі ён прачытаў «Удава», то зразумеў, што яна даведалася пра палюбоўніцу.**

Настаўніца расказала вучням пра вялікіх вынаходнікаў і пытаецца:
— Дзеці, а што б вы хацелі вынайсці?
— Я вынайшаў бы такога робата — націснуў кнопку, і ўрокі зроблены!
— Пеця, ды ты самы сапраўдны гультай! А што нам скажа Вова?
— А я б вынайшаў такі аўтамат, які б націскаў на гэтую кнопку!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1331.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 красавіка 2017 года.